## Зачапіла



### В. Канюта. «ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА» (*«Звязда» за 16 ліпеня*)

— У партызанскія атрады ішлі людзі, якія не атрымлівалі загаду ваяваць. Гэта былі сапраўдныя патрыёты, якія не маглі дапусціць, каб на іх тэрыторыі пасяліліся чужаземцы. Мой бацька таксама быў у партызанах. Ён добра разумеў, які лёс чакае тых, хто трапіў у палон. Таму без усялякага страху (магчыма, гэта ён нам так казаў) ішоў на любыя партызанскія заданні — вырашыў помсціць ворагу да апошняга. Можа, гэтая неверагодная смеласць і дапамагла яму не толькі дажыць да Дня Перамогі, а і сустрэць яшчэ не адну яе гадавіну.

У мясцовасці, адкуль я родам, былых франтавікоў і партызанаў ведалі ўсе, часта збіраліся, каб паслухаць іх успаміны. У кожнага з іх была свая гісторыя, якая сёння падаецца вялікім подзвігам. А колькі людзей не мела магчымасці расказаць пра свой баявы шлях...

Мне падаецца, што ўсё ж такі ў Беларусі, якая сапраўды стала сімвалам партызанскага руху, павінен з'явіцца Дзень партызана, як гэта ёсць у Расіі. Каб увекавечыць памяць людзей, якія сапраўды без пафасу, без загадаў, без усялякіх прымусаў станавіліся ў рады змагароў супраць нямецкіх захопнікаў. Каб нагадаць цяперашнім і будучым пакаленням, якой цаной далося мірнае жыццё сёння.

**Міхаіл Шпак**, *Лагойскі раён.*

### Д. Лабажэвіч. «ЧЭМПІЯНАТ ПАКАЗАЎ ВАЖНАСЦЬ ТРЭНЕРА» (*«Звязда» за 19 ліпеня*)



— Цікава ведаць меркаванні такіх (без перабольшання) вялікіх спартсменаў, як Анатоль Байдачны, аб такіх буйных і ў той жа момант неадназначных турнірах, як чэмпіянат Еўропы, які прайшоў сёлета.

Памятаю Анатоля і па выступленнях за «Дынама» і, як трэнера. Заўсёды гаворыць адкрыта і без усялякага згладжвання вострых вуглоў. Ад гэтага бывае трохі рэзкім, але лепш так, чым хаваць праўду і пастаянна апраўдвацца.

Згодны, што немцы паказалі самую цікавую гульню на чэмпіянаце і, думаю, Анатоль таксама «хварэў» за іх. І яшчэ — вельмі б хацелася ўбачыць Анатоля Мікалаевіча ў справе, бо ён сапраўды ўжо вырасціў і яшчэ можа вырасціць добрых футбалістаў.

**Аляксандр**, *г. Магілёў.*

### А. Шкляеў. «МІФЫ ПРА САБАК» (*«Звязда» за 19 ліпеня*)

— Цікавы матэрыял. Я згодна з аўтарам — шмат што ў паводзінах сабакі залежыць ад таго, як яго выхавалі. Але што рабіць з тымі, хто не ведае ці не хоча ведаць пра асаблівасці дрэсіроўкі сабак розных парод? Ды нават так званых дварнякоў не імкнецца хоць колькі-небудзь стрымліваць у паводзінах...

Сын маіх знаёмых аднойчы прывёз да бацькоў каўказскую аўчарку. Шчанюком яна была любіміцай усёй вёскі, а калі вырасла, стала яе гразой. Больш за ўсё аўчарка чапала свойскую жывёлу (курэй, авечак), а потым пераключылася і на людзей. На шчасце, жанчыне, якую пакусаў сабака, сур'ёзных траўмаў удалося пазбегнуць. Але колькі жаху было для дзяцей і дарослых ад гэтай грамадзяні! У выніку бацька хлопца забіў сабаку, каб жывёла не нарабіла больш сур'ёзных спраў.

І што вы думаеце?.. Праз некаторы час на яго двары зноў з'явіцца «цуд» (не ведаю дакладна пароду, але здаецца, сабака быў падобны да мастыфа). Ізноў пачаліся жахі. Сабака не быў прывязаны, ён часта гуляў па вуліцы, кідаўся на дзяцей. Пачаліся папрокі гаспадарам гэтага сабакі ад мясцовых жыхароў...



Для мяне гэтая гісторыя — яркі прыклад таго, наколькі безадказна людзі ставяцца да сабак і да тых, хто жыве побач. І большая віна тут, мне здаецца, не знаёмых, а іх сына — сапхнуць на бацькоў тое, што павінен быў рабіць ён сам...

Я ўпэўнена — толькі тады, калі чалавек гатовы адказваць за паводзіны сабакі, ён можа стаць яе гаспадаром.

**Марыя Паўлаўна**, *Мінскі раён.*

### С. Барысенка. «А СЭРЦАЙКА СТУКАЕ» (*«Звязда» за 20 ліпеня*)

— Сёння я шчаслівая бабуля, а шмат гадоў таму... Прыехала з радзільні дачка з унучкам. Раптам тэмпература ў яе падскочыла да 40 — мастыт. Раней не гаварылі, не навучалі грудному кармленню, а таму мы мала ведалі, і амаль кожная сутыкалася з такой непрыемнасцю. Прыехала «хуткая». Доктар пытаецца: якая цяжарнасць па ліку? Дачка прамаўляе: другая... Як другая? Значыць, першая скончылася абортам? Ногі ў мяне сталі ватнымі, рукі непаслухмянымі, язык знямеў — і дагэтуль памятаю той стан. Маё дзіця прайшло праз «пекла», а я нічога пра гэта не ведала! Я выдатна разумею, пра што кажу, бо і сама нарадзіла толькі адно дзіця, але цяжарнасці ў мяне было тры. І мая мама таксама нічога пра гэта не ведала. Так вось мы і жывём адна ад адной такія жудасныя ўчынкі, так і жывём з велізарным цяжарам на душы...

А колькі жанчын вось так, як мы з дачкой, моўчкі, не гаворачы нікому з самых блізкіх людзей, ішлі на гэту страшную працэдуру — рызыкуючы сваім здароўем, сваім шанцам зацяжарыць калі-небудзь яшчэ... Звычайна жанчыны паведамляюць аб такім кроку свайму мужчыну, але што тыя? Пакажыце мне мужчыну, які б угаворваў пакінуць дзіця, ногі цалаваў і прасіў: малю, не рабі гэтага! Як жа хочацца вырасціць унука такім, каб ён не дазволіў сваёй каханай прайсці праз такія фізічныя і псіхічныя пакуты — барацьбу з самой сабой, здольнасць прымаць такое рашэнне і жыць з гэтым пасля. Бо насамрэч для жанчыны, якая перарвала цяжарнасць, пакуты пачынаюцца нават не ў момант фізічнага болю, а крыху пазней, калі нараджаюцца спустошанасць, страх, адчай, пакаянне. Так што гэта проста выдатна, што вы напісалі пра магчымасць паразмаўляць з урачамі, падумаць, зноў паразмаўляць і параіцца. Няхай хоць з чужым чалавекам — калі ўжо ў нашым грамадстве не заведзены падобныя размовы са сваякамі. І самае важнае, што налета, як вы напісалі, будзе магчымасць сямейнага кансультавання. Нашых мужчын трэба выхоўваць інакш, далучаць да такіх важных рэчаў.

**Ганна Васілеўна**, *г. Мінск*

WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY

## Простая мова

# ТРЭБА ЕХАЦЬ...

**Сіноптыкі ўгадалі: шквалісты вецер нагнаў-такі чорных хмар, нарабіў бяды. Недзе пазносіла дахі, сплюшчыла машыны, пад вокнамі паламала, павырывала з карэннем дрэвы — старыя, любімыя. Шкада...**
**Амаль як людзей.**

### БЫВАЕ...

Гэтага б, магчыма, не ўбачыў, калі б... не пачуў — пранізлівы скрып тармазоў, гулкае «ба-а-бах!..

Так і ёсць, ДТЗ: стары, але добра захаваны «жыгулёк» «пацалаваў» навюткую белую «мзду».

— Што зараз будзе?! — люд на прыпынку, падобна, чакаў скандалу.

А яго не было: пажылы кіроўца «мазды» паляпаў па плячы збялелага юнака з «жыгулёў», сказаў:

— Бывае, брат... Нічога страшнага...

А яно ж і сапраўды... Калі ўсе жывыя.

### ПРЫСУД

І без грошай бяда, і з грашыма: не прывыкнуць пакуль да новых. Адна суседка з зяцем пасварылася: ён ёй 10 рублёў на тэлефон паклаў. Пакуль дайшло, што гэта ж новымі... Другая за два тыдні да пенсіі хацела 500 тысяч зняць (старымі), а на картачцы, убачыла, толькі 90... Ледзь прытомнасць не страціла.

Наша прымаўка: «Вучыся, нябожа, вучэнне паможа», казахская: «Старога вучыць, што мёртвага лячыць».

### ЛЕПЕЙ БОЛЬШ, ЧЫМ МЕНШ

Пакінуць «на чай» таксісту ці афіцыянту — гэта лёгка, таму што прывычна. Цырульніцы — пакуль складаней... Як для мяне... А вось для нейкага хлопца — не: ён, хораша пастрыжаны, устае з суседняга крэсла, кіруе да касы, разлічваецца, потым вяртаецца назад, да працоўнага століка сваёй майстрыхі — кладзе на яго 20 тысяч (старымі), кажа:

— Добрага вечара!

Дзяўчына ўсміхаецца, дзякуе, хавае грошы ў кішэню і (хай моўчкі), але ж кажа ўсім, што вечар быў бы лепшым, калі б грошай было больш.

### «КУПІЦЬ ЗЯМЛЮ...»

Субота, надвячорак, дарога — па нашай зямельцы: гэта значыць, праз лясы і палі, праз вёскі і *паўдачныя масівы.*

Непадалёк ад яго, чарговага і адносна новага, на вялікім лісце фанеры абвестка: «Прадам два ўчасткі зямлі...»

Была, відаць, аказія — хапнуў чалавек!

І вельмі хутка здаволіўся.

### КОЖНАМУ СВАЁ

...Маруся з адпачынку прыехала — загарэлая, шчаслівая. Дзесяць дзён на Кіпры была, і цяпер ёй за шчасце ўзгадаць, якое там сонца і мора, якая кухня і танцы. Найбольш яе ўразіў танец са шклянкамі:

— Уяўляеце: адзін мужык 13 штук узяў — і ні ў водным воку, танцуе далей!

— Гэтага быць не можа! — абрывае дачку п'янаваты бацька.

— Можа! Далібог, — хрысціцца тая. — На ўласныя вочы бачыла!

— Дык, можа, чарак? — не верыць Фама.

— Не, татачка, шклянак... Мы ад яго за тры метры сядзелі, бачылі: першыя ён сам узяў, а іншыя людзі падносілі, ставілі...

— І ён што — піў?

— А табе б толькі піць! — крычыць на яго Марусіна мама, якая ўжо чула пра гэтыя танцы. — Ён на галаву іх ставіў — адну на адну, потым танцаваў.

— А сэнс?

...Для некага ён і сапраўды ў тым, каб выпіць. Для некага — каб паказаць сваё майстэрства, сваю, краіну, каб здзівіць, каб пацешыць людзей.

### ВЫРАС ПАД НЕБА...

У гэтай сям'і дзіцятка было адно, ды такое ж кволае... Не ведалі, чым яго, беднае, пакарміць, як палажыць і палячыць. Бацька са скуры вылузваўся, каб болей грошай зарабіць, маці працу пакінула, каб заўжды быць побач. Што малому, вядома ж, на карысць, — і ў год, і ў пяць. Праўда, вось гэтага нават у дзесяць за ручку вадзілі ў школу, за ручку прыводзілі дамоў... Але ж ніхто не папракне: зберагалі дзіця, выгадавалі! Ды якое...

Днямі ў метро яго згледзела: і сапраўды — высокае, стройнае, у светлым дыхтоўным пінжаку з разрэзамі па баках... Прычым пярэдня полы яго пакінуты навыпуск, а «спінка», наадварот, запраўлена ў «штонікі».

Без мамы, відаць, апраналася, не ўмеючы ў... 15 гадоў.

### З НАДЗЕЯЙ...

Тост. Дзве сястры (блізняты) адзначаюць 20-годдзе і міжволі азіраюцца назад.

— Мінулыя 10 гадоў былі вельмі цяжкімі, — кажа адна.

— Так-так, — згаджаецца другая. — Мы заканчвалі школу, здавалі экзамены, па чарзе ўлюбляліся, не ведалі, куды паступаць... Але ўсё гэта ўрэшце ўтрэслася і зараз мы зажывём!..

Тыя ж сёстры адзначаюць 30-годдзе. І зноў, азірнуўшыся назад, прыгадваюць, як ім было цяжка, бо абедзве давучваліся, бо, нічога не ўмеючы, пачыналі працаваць, бо кахалі і выходзілі замуж, жылі на прыватных кватэрах, нараджалі і гадавалі дзяцей... «Але вось зараз яно ж павінна палягчэць?» — спадзяюцца яны.

Усё тыя ж сёстры і праз тыя ж 10 гадоў адзначаюць 40-годдзе. Зноў азіраюцца і зноў уздыхаюць, бо не збыліся, на жаль, іх мары на лягчэйшае жыццё: не хапала то грошай, то клятых «квадратных метраў»; падрасталі, хварэлі і не слухаліся дзеці, і ўжо яны здавалі экзамены, не ведалі, куды паступаць і не ў тых улюбляліся; не так, як трэба, паводзілі сябе мужы, старэлі бацькі...

Аднак шампанскага гэтыя жанчыны выпілі, бо мелі ж за што: яны ўсё перажылі — змаглі, яны захавалі сем'і. Да таго ж яны па-ранейшаму спадзяваліся, што ўжо наступныя дзесяць гадоў...

Ірачцы, прыяцельцы, як тым сёстрам, хутка 50, і гэты тост — пра яе... У многім... Хоць і не ва ўсім, бо ў Ірачкі — апроч згаданага — рана памерлі бацькі і муж, на залежнасць ад наркотыкаў хварэе брат. Дачка таксама абы з кім звязалася: кінула вучобу (з трэцяга курса... На бюджэтным!), з'ехала ў замежжа...

І тым не менш за святочным сталом юбілярка абавязкова вып'е — шампанскага! І, вядома ж, паспадзяецца, што некалі зажыве. Бо без гэтага — аніяк...

І ці толькі ёй?

### ШТО ЁСЦЬ...

За вочы па імені ды па бацьку (Міхайлаўна!) яе ніхто не зваў: для ўсіх — Палятухай была, бо, маючы вялікую сям'ю і такую ж гаспадарку, век нідзе не спынялася, усім казала: «Паляту...»

Папытацца, куды, у яе не паспявалі, бо знікала раней, хоць ведала, што ўсёй работы не пераробіш, што лётай не лётай, а ў канцы ўсё адно панясуць — памалу.

У вось гэтым, апошнім, здаецца, памылілася, бо, нарадзіўшыся ў 1930-м, доўга жыла — аж да нашых дзён, цікавых яшчэ і тым, што людзей (нават на пагост!) ужо амаль не носяць, а возяць, прычым досыць хутка.

### ЦІКАВАЯ ПРАПАНОВА

Двое — ён і яна. Кароткі дыялог:

— Можна, я зраблю табе прапанову, ад якой ты не зможаш адмовіцца?

— ?!

— Пайшлі паямо...

Гэта анекдот, а зараз — чысцюткая праўда.

Дзень. Праца. Тэлефонны званок:

— Не перашкодзіла? — павітаўшыся, пытае прыяцелька і, не чакаючы адказу, тут жа дадае: — Можна, я паспавядаюся — у трох словах?

Прапанова, згадзіцеся, ад якой немагчыма адмовіцца!

### ТРЭБА ЕХАЦЬ

...Куды ў выхадныя, у Тадэвушаны ніхто не пытае: навошта, калі адказ вядомы: «На гістарычную радзіму, у вёску». Бо там, дзякуй Богу, матулька, бо ў яе — з «паўвалочкі зямлі» і ўся яна абрабляецца, гэта значыць засяваецца збажынай, засаджваецца бульбай ды іншай агароднінай. Потым — і зноў жа ўсёй сям'ёй — даглядаецца.

— Цяжка, — за сябе і за матулю стогнуць дзеці. — Можа, зменшыць крыху «пасяўныя плошчы», можа, залужыць трохі зямлі?

— Пасля мяне, — строга кажа ім гаспадыня, — хоць асфальт палажыце. А пакуль я жывая — не!

— Але ж нам не трэба столькі гародніны, столькі бульбы, — даводзяць маладзейшыя. — Ды і тую танней купіць...

— А вось суседзі — садзяць, — гне сваё бабуля. — Мне таксама брыдка не садзіць.

— Ну якое ж брыдка? Ты ў пашпарт паглядзі: твае суседзі на дваццаць, на трыццаць гадоў маладзейшыя! — абураюцца дзеці.

— Дык мне ж за вас брыдка будзе...

А таму куды ў выхадныя, у Тадэвушаны ніхто не пытае. Навошта, калі адказ вядомы: у вёску.

### КАБ ПОМНІЛІ?

...Першае, што робім, прыехаўшы на мора, — ідзём да яго вітацца. Апошняе, што робім з'язджаючы, — увечары на апусцелым пляжы рассцілаем маленькі абрус, ставім на яго пасудзінкі з садавінай, віном, доўга-доўга сядзім: глядзім на загадкавы агні і зоркі, слухаем шум вады, нешта ўспамінаем, марым, маўчым...

У той раз ужо, здаецца, сыходзілі, калі побач пачуліся галасы, калі ззаду, з набярэжнай, са звонкім, пранізлівым: «І-і-і-і...» проста ў ваду пабегла дзяўчо... І не спынілася: як была — у нейкіх басаножках, сарафане — «абняла» высокую хвалю і паплыла...

Спадарожнік яе — малады, танклявы дзяцюк — застаўся на беразе: слухаў-глядзеў, як смешна яна плыве, усміхаўся. Відаць, чакаў, пакуль яго русалачка (а ўжо ж мокрая, вабная) выйдзе з вады, падбяжыць, павісне на шыі — шчаслівая-шчаслівая: ад таго, што побач каханы, ад таго, што ўпераздзе ўсё жыццё, а за спінай — мора.

...Гэта было летась і, напэўна ж, пазалетась... І сто, і дзвесце гадоў таму ў найчароўнейшым куточку свету — у Ніцы, на Блакітным беразе Міжземнага мора, сёлета — неабсяжнага, як людское... гора.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*